Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар БДУКМ
________________ А.А.Корбут
"4" студзеня 2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД-30/эвуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГІСТОРЫЯ МАСТАЦКАЙ КРЫТЫКІ І МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае),*
*спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01 Кампаратыўнае мастацтвазнаўства*

2018

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта ОСВО 1-21 04 02-2013 Мастацтвазнаўства (па напрамках) і вучэбнага плана па спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01 Кампаратыўнае мастацтвазнаўства, рэг. № Д21-1-72/17вуч. ад 04.07.2017

**СКЛАДАЛЬНІК:**
*А.М. Шаройка,* дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*А.У. Макарэвіч,* старшы выкладчык кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці "Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў";

*Я.У. Голікава-Пошка,* навуковы супрацоўнік аддзела экранных мастацтваў дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай беларускай і сусветнай мастацкай культуры* ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 5 ад 12.10.2017);

*прэзідыумам навукова-метадычнага савета* ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 2 ад 14.12.2017)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за выпуск: *А.М. Шаройка*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя мастацкай крытыкі і мастацтвазнаўства” прызначана для студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае).

Вучэбная дысцыпліна “Гісторыя мастацкай крытыкі і мастацтвазнаўства” з’яўляецца важнай у вывучэнні сусветнай і айчыннай мастацкай культуры ў працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне мастацтвазнаўства. Яна сутнасна пашырае і паглыбляе веды ў галіне гісторыі, тэорыі, метадалогіі мастацтвазнаўства і мастацкай крытыкі.

У адпаведнасці з Адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі ОСВо 1-21 04 02-2013 Мастацтвазнаўства (па напрамках) пад час вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя мастацкай крытыкі і мастацтвазнаўства” студэнт павінен набыць наступныя:

*Акадэмічныя кампетэнцыі:*

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

АК-13. Валодаць інфармацыяй у галіне гістарычных ведаў, разумець рухаючыя сілы і заканамернасці гістрычнага працэсу для ўзбагачэння зместу сваей даследчыцкай мастацка-творчай і педагагічнай дзейнасці.

АК-18. Умець бачыць і інтэрпрэтаваць факты, падзеі, з’явы сферы прафесійнай дзейнасці ў шырокім гістарычным і культурным кантэксце.

*Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:*

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-6. Умець працаваць у калектыве.

САК-9. Праяўляць ініцыятыву і творчы падыход, у тым ліку да нестандартных сітуацый.

*Прафесійныя кампетэнцыі:*

ПК-1. Кваліфікавана праводзіць навуковыя даследаванні па выяўленню, апісанню, аналізу, рэцэнзаванню мастацкіх твораў.

ПК-11. Аналізаваць сучасны стан і перспектывы развіцця мастацтва.

ПК-12. Прымаць удзел у правядзенні экспертызы твораў мастацтва, даваць кваліфікаваныя заключэнні і кансультацыі.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – паказаць эвалюцыю поглядаў на мастацтва. Набытыя пад час навучання веды павінны дазволіць студэнту дасведчана, пісьменна і прафесійна арыентавацца ў шэрагу агульных гістарычных і тэарэтычных пытанняў у галіне мастацтвазнаўства.

Асноўныя *задачы* вучэбнай дысцыпліны:

- паглыбіць веды пра спецыфічныя рысы мастацтвазнаўства;
- сфарміраваць уяўленне пра агульнае і адметнае ў тэарэтычным асэнсаванні і ацэнцы твораў мастацтва;
- азнаёміць з асноўнымі мастацтвазнаўчымі крыніцамі і крытычнымі публікацыямі.

На пры канцы вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- асноўныя паняцці гісторыі і тэорыі мастацтва, бачыць іх у гістарычнай эвалюцыі;
- творчасць выдатных мастацтвазнаўцаў і крытыкаў розных мастацкіх эпох, школ, кірункаў;
- сучасныя прынцыпы ўспрымання мастацтва, асноўныя падыходы і метады мастацтвазнаўства.

Студэнт павінен *умець:*

- характарызаваць мастацкую эпоху і асноўныя этапы яе развіцця;
- вызначаць спецыфіку нацыянальнага мастацкага працэса;
- рабіць тыпалогію і класіфікацыю жанраў мастацтвазнаўчых даследаванняў;
- пісьмова выказваць асабістае меркаванне ў розных жанрах мастацтвазнаўчых работ;
- выкарыстоўваць набытыя веды ў прафесійнай практыцы.

Студэнт павінен *валодаць:*

- алгарытмам вывучэння, засваення, практычнага выкарыстання тэарэтычных і гістарычных ведаў пра мастацтва;
- навыкам самастойнай работы з рэкамендаванай літаратурай і Інтэрнэт-рэсурсамі па гісторыі мастацтвазнаўства і мастацкай крытыкі;
- навыкам самастойнага аналізу і крытычнага асэнсавання інфармацыі па асобных пытаннях гісторыі мастацтвазнаўства і мастацкай крытыкі;
- навыкам вядзення дыскусій па асноўных праблемах вывучаемай мастацтвазнаўчай дысцыпліны.

Асаблівасць вывучэння дысцыпліны “Гісторыя мастацкай крытыкі і мастацтвазнаўства” заключана ў яе міждысцыплінарным характары. Гэта вучэбная дысцыпліна з’яўляецца злучальным звяном паміж рознымі мастацтвазнаўчымі дысцыплінамі і абапіраецца на набытыя веды такіх вучэбных дысцыплін, як “Мастацтва XX ст. Раздзел 1. Традыцыйнае мастацтва”, “Мастацтва XX ст. Раздзел 2. Экранная культура”, “Кампаратывістыка ў мастацтве”, “Тэорыя і гісторыя мастацтва”.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя мастацкай крытыкі і мастацтвазнаўства” ўсяго прадугледжана 204 гадзіны, з іх 96 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відам заняткаў: лекцыі – 58 гадзін, семінарскія – 38 гадзін.

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік і экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## УВОДЗІНЫ

Мастацтвазнаўства ў сістэме гуманітарных і прыродазнаўчых навук. Прадмет і задачы мастацтвазнаўства. Асаблівасці фарміравання мастацтвазнаўства як асаблівай вобласці навуковай дзейнасці. Гістарычная змена ўяўленняў пра мастацтва і задачы яго даследавання. Сучасная структура мастацтвазнаўства. Інстытуцыянальныя асновы сучаснага мастацтвазнаўства. Арганізацыйныя формы абмену навуковай інфармацыяй. Віды мастацтва ў мастацкай культуры (праблемы класіфікацыі мастацтваў).

Сістэма мастацтваў і яе гістарычныя метамарфозы. Мастацтвазнаўчае даследаванне, яго жанры і формы. Мастацкая крытыка, яе функцыі, формы і задачы. Асноўныя этапы фарміравання і развіцця мастацтвазнаўства

### Тэма 1. Антычныя мысліцелі пра значэнне мастацтва

*Музычнае мастацтва*. Вучэнне аб этасе, аб ладах, пытаннях акустыкі ў музычна-тэарэтычнай навуцы ў Старажытнай Грэцыі. Вучэнне аб музычным этасе як агульнаантычная тэорыя, якая была распрацавана піфагарыйцамі (лічба як аснова ўсіх з'яў, вучэнне аб гармоніі сфер), Платонам ( працы “Дзяржава”, “Законы”, выказванні аб уздзеянні музыкі на выхаванне грамадзян, аб уздзеянні мелодыі і рытма на душу), Арыстаксенам ( працы “Элементы рытмікі”, “Элементы гармоніі”). Устанаўленне паняццяў “музыка”, “мелодыя”, “рытм”, “гама” ў Старажытнай Грэцыі. Вучэнне аб музычным этасе – аснова ўсёй педагагічнай тэорыі, грамадскай адукацыі старажытных грэкаў (грэч.. – “адукаваны” чалавек, “мусічэскі”, гэта значыць той, хто атрымаў выхаванне з дапамогай музыкі.).

Этычная характарыстыка музычных ладоў (дарыйскі – бадзёрасць, мужнасць; фрыгійскі – неўраўнаважанасць, вакхічнасць; іанійскі – пяшчота, расслабленасць; лідзійскі – плачэўны этас).

*Тэатральнае мастацтва*. Антычныя мысліцелі аб тэатры 400 г. да н.э. – 1 ст. н. э. : Платон і яго Афінская Акадэмія; філасофская школа Арыстоцеля – яго творы “Паэтыка”, “Рыторыка”, “Метафізіка”, “Палітыка”; Гарацый і яго трактат “Навука паэзіі”, рымскі архітэктар Вітрувій і яго думка аб тэатральнай архітэктуры (“Об архитектуре”); трактаты аб аратарскім мастацтве Квінціліяна і Цыцэрона. Працы аб маралі Луцыя Сенэкі.

*Выяўленчае мастацтва.* Праблема стылю ў выяўленчым мастацтве Старажытнага Рыма. Тэорыя каларыта і прапорцыі ў мастацтве Антычнасці. Першыя сачыненні па тэорыі мастацтва: трактаты мастакоў (Паліклет, Эўфранор, Апелес), жыццяпісанні (Дурыс, Ксенакрат), апісанні твораў мастацтва. “Натуральная гісторыя” Плінія Старэйшага – галоўная крыніца па гісторыі мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 2. Тэорыя мастацтва ў эпоху Сярэднявечча

*Музычнае мастацтва.* Вызначэнне ў раннім сярэднявеччы музыказнаўства як навукі; разуменне музыкі як навукі, якая ўваходзіла ў склад "сямі вольных мастацтваў": трывіум – граматыка, рыторыка, логіка; квадрывіум – арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка. Касіядор (487–578 гг.) і яго думкі аб падзяленні музыкі і навукі аб ёй на гармоніку, рытміку, метрыку (праца "Пра навукі і мастацтва"). Заснавальнік музыказнаўства як навукі рымлянін Баэцый (480–524 гг.), сістэматызацыя ім у пяцітомнай працы "Пра музычныя ўстанаўленні" ўсіх паняццяў пра музыку: музыка сусветная (гармонія сфер), музыка чалавечая (вакальная), музыка інструментальная.

Абагульненне найбольш ранніх звестак і распрацоўка сістэмы царкоўных ладоў сярэднявечча на аснове прафесійнай музыкі (грыгарыянскі харал перш за ўсё) тэарэтыкам Аўрэліянам (IX ст.): 8 дыятанічных гукарадаў (дарыйскі, гіпадарыйскі, фрыгійскі, гіпафрыгійскі, лідыйскі, гіпалідыйскі, міксалідыйскі, гіпаміксалідыйскі).

Здзяйсненне рэформы натацыі італьянскім музыкантам, тэарэтыкам, педагогам Гвіда д'Арэцца (990-я–1050 гг.). Увядзенне ім у практыку нотнага стану з вызначэннем назваў гукаў, што трывала ўвайшло ў жыццё. Раскрыццё і абгрунтаванне сістэмы натацыі і яе практычнага прымянення (трактат "Кароткае слова пра вывучэнне музыкі").

Удасканаленне натацыі ў XIII ст., распрацоўка запісу працягласцей гукаў. Мензуральная сістэма ("мензура" – мера), яе вызначэнне (трактат "De musica mensurabili positio", каля 1280 г.) Іаганам дэ Гарландыя і Франкам Кёльнскім.

У Расіі – першыя спробы класіфікацыі і сістэматызацыі асноўных відаў мастацтваў (пастановы Стогаловага Сабора, 1551 г.). Стогаловы Сабор пра царкоўны спеў. Першыя пеўчыя "азбукі" (канец XV–XVI стст.) – своеасаблівыя тэарэтычна-метадычныя дапаможнікі па знаменнаму пісьму. Значны ўклад беларускіх і ўкраінскіх вучоных-філолагаў, багасловаў – С. Полацкага, Е. Славінецкага, А.Сатаноўскага, у справу адукацыі і мастацтвазнаўства. Царкоўна-пеўчая палеміка (ананімнае "Пасланне" да патрыярха Гермагена, памфлет інака Еўфрасіна і інш.) наконт выпраўлення пеўчых кніг.

Іван (Шайдур) Шайдураў – рускі распеўшчык першай паловы XVII ст., распрацоўшчык сістэмы кінаварных памет, пытанняў тэорыі спявання. Значэнне тэарэтычных распрацовак і новаўвядзенняў І. Шайдура для рускага музычнага мастацтва.

"Азбука знаменнага спявання" Аляксандра Мезянца (Стрэмавухава) – першае, найбольш поўнае даследаванне тэорыі знаменнага спявання, зробленае ў сярэдзіне XVII ст.

*Тэатральнае мастацтва.* Адсутнасць тэорыі мастацтва тэатра ў "змрочную" (Гегель) эпоху Сярэднявечча. Цертуліян і яго праца "Аб відовішчах": асуджэнне акцёра, прызыў "вынішчаць" усялякага рода тэатральныя відовішчы.

*Выяўленчае мастацтва.* Тэорыя мастацтва як неаддзельная частка тэалагічнага светапогляду. Праблема падпарадкавання відаў і жанраў выяўленчага мастацтва патрэбам культавых традыцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 3. Вядучыя прадстаўнікі эпохі Адраджэння пра ролю мастацтва ў жыцці чалавека**

<u>*Музычнае мастацтва.*</u> Новы ўзровень музычна-тэарэтычнай навукі ў XVI ст. Нідэрландскі кампазітар і вучоны Іаганэс Цінкторыс, яго працы “Вызначальнік музычных тэрмінаў” (1472–1473 гг.), “Кніга пра мастацтва кантрапункта” (1447 г.). Нямецкі вучоны Генрых Ларыцці (Гларэан), яго трактат “Дванаццаціструннік” (1547 г.), у якім абаснаваны, апрача сярэднявечнай сістэмы ладоў, функцыянаванне яшчэ і іанійскага ладу (практычна мажора і мінора). Вучэнне пра гармонію італьянскага кампазітара і музычнага тэарэтыка Дж. Царліна і яго працы “Устанаўленне гармоніі”, “Доказы гармоніі”, “Музычныя забаўленні”.

Музыка ў сістэме “сямі вольных навук” у калегіўмах і акадэміях Беларусі. Выказванні Ф.Скарыны пра музыку. Тэарэтыкі музычнага мастацтва ў XVII ст. : Мікалай Дылецкі (1630–1680 гг.) – аўтар “Ідэя мусікійскай граматыкі”, Аляксандр Мезянец (?–не раней 1677 г.) – стваральнік сістэмы нотапісу ў царкоўных пеўчых кнігах. Першыя нотадрукі на Беларусі: Берасцейскі канцыянал Яна Зарэмбы (1558 г.), Нясвіжскі канцыянал (1563 г.).

<u>*Тэатральнае мастацтва*</u>. Пурытанская тэорыя пра асуджэнні непрыстойнасці і амаральнасці ў тэатры С. Часона “Школа злоўжыванняў” (1577 г.); Т. Лоджа “Абарона паэзіі, музыкі і тэатральных п’ес” (1580 г.); Т. Нэша “Безграшовы пірс”(1592 г.).

“Скарбніцы розуму” Ф. Мірза (1598 г.) – фундаментальны агляд англійскай драмы і тэатра Адраджэння, у асноўным творчасці У. Шэкспіра. Трактаты нямецкіх іезуітаў Я. Понтана (1594 г.), І. Рэнануса (1613 г.) пра “камедыянтаў”, “Кніга аб нямецкай паэтыцы” М. Опіца (1624 г.). Працы французскіх асветнікаў Ж. Пелец’е “Паэтычнае мастацтва” (1555 г.), Ж. дэ Ла Тая “Мастацтва трагедыі” (1572 г.), Саразэна “Разважанне аб трагедыі” (1639 г.), Ф. Абіняка “Практыка тэатра” (1657 г.), Н. Буало “Паэтычнае мастацтва” (1674 г.).

<u>*Выяўленчае мастацтва*</u>. З яўленне новых крытэрыяў ацэнкі мастацкіх твораў; абуджэнне інтарэсаў да гістарычных этапаў у развіцці мастацтва, перш за ўсе да антычнага мастацтва. Ч. Чэніні і яго “Кніга аб мастацтве ці трактат аб жывапісу”. Трактаты Л.-Б. Альберці “Пра жывапіс”, “Пра статую”, “Пра дойлідства”. Практычная і тэарэтычная дзейнасць Леанарда да Вінчы, яго “Трактат пра жывапіс”. Летапісца эпохі Адраджэння Дж. Вазары, яго кніга “Жыццяапісанні найбольш знакамітых жывапісцаў, скульптараў і дойлідаў” як першая мастацтвазнаўчая праца. Тэарэтык мастацтва А. Дзюрэр і яго “Чатыры кнігі пра прапорцыі чалавека”.

**Тэма 4. Мастацтвазнаўчыя даследаванні ў эпоху Класіцызму (Заходняя Еўропа)**

<u>*Музычнае мастацтва.*</u> Уяўленні аб усемагутнасці чалавечага розуму, прыярытэце асветы і навукі ў эпоху Асветніцтва. Светапогляды французскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

філосафаў–“энцыклапедыстаў” Вальтэра, Ш. Мантэск’е, Д. Дзідро, Ж. Ж. Русо, нямецкага асветніка Г. Э. Лесінга як тэарэтычная першакрыніца і адлюстраванне тэндэнцый фарміравання мастацка-грамадскага жыцця.

Сатырычны трактат Б. Марчэла “Модны тэатр” (1720 г.). Тэарэтычныя трактаты Ж. Б. Рамо “Трактат пра гармонію” (1722 г.), “Новая сістэма музычнай тэорыі” (1726 г.), “Дысертацыя пра розныя метады акампанемента на клавесіне і на аргане” (1732 г.), “Гарманічныя асновы музыкі” (1737 г.), “Доказ прынцыпу гармоніі” (1750 г.). І. Матэзан і яго кніга “Дасканалы капельмайстар” (1739 г.). Асноўныя прынцыпы опернай рэформы К. Глюка, галоўныя крытэрыі прыгажосці ў музыцы – “прастата, натуральнасць і праўда” (К. Глюк). Меркаванні Ф. Шылера, І. В. Гётэ пра перавыхаванне чалавека з дапамогай мастацтва.

*Тэатральнае мастацтва.* Найбольш вядомыя тэатразнаўчыя працы – “Тэатральны спадарожнік, ці Справаздача пра ўсіх англійскіх драматургах і іх п’есах” (Т. 1–2) Д. Бейкера (1764 г.), “Брытанскі тэатр” і “Гістарычны агляд англійскай сцэны” Э. Малона (1790 г.). “Гісторыя англійскай драматычнай паэзіі да эпохі У. Шэкспіра і аналы тэатра да рэстаўрацыі” Дж. П. Кальера (1831 г., Т. 1–3). “Нямецкі тэатр згодна правілаў старажытнай Грэцыі і Рыма” Т. Готшэда (1741–1745 гг.), “Лаакаон...” (1766 г.) і “Гамбургская драматургія” (1767–1769 гг.) Г. Э. Лесінга.

Тэатральная крытыка Германіі перыяду “Буры і націску” (І. В. Гётэ “Прамовы аб Шэкспіры” (1771 г.) і “Нататкі аб тэатры” (1774 г.), Р. Вагнер “Лісты аб Зейляраўскім тэатральным грамадстве” (1777 г.), Ф. Шылер “Пра сучасны нямецкі тэатр” (1782 г.) і “Пра трагічнае мастацтва” (1792 г.), Ф. Цыглер “Сістэмы сцэнічнага мастацтва” (1820 г.).

Дэні Дзідро – заснавальнік “новай” тэатральнай думкі пра тэатр эпохі Асветніцтва (“Прадмова да “Пабочнага сына” (1757 г.) і “Аб драматычнай паэзіі” (1758 г.). П.-А. Бамаршэ “Вопыт аб жанры сур’ёзнай камедыі” (1767 г.). С. Ж. Эц’ен і А. Мартэнвіль “Гісторыя французскага тэатра з пачатку рэвалюцыі да агульнага ўз’яднання” (Т. 1–4, 1802 г.). А. Руайе “Усеагульная гісторыя тэатра” (1870 г.). Ф. Сарсэ “Камедыі Франсэз. Акцёры і актрысы”.

***Выяўленчае мастацтва***

Вылучэнне мастацтвазнаўства як самастойнай навукі. Д. Дзідро як заснавальнік і рэдактар “Энцыклапедыі, ці тлумачальнага слоўніка навук, мастацтваў і рамёстваў”. Увядзенне Г. Э. Лесінгам тэрміна “выяўленчыя мастацтвы”. Англійскі тэарэтык і заснавальнік сацыяльна-крытычнага накіравання ў еўрапейскім мастацтве У. Хогарт.

## Тэма 5. Навуковыя распрацоўкі ў галіне мастацтва другой паловы XVII –XVIII стст. (Беларусь, Расія)

*Музычнае мастацтва* Глыбокія перамены ў рускай мастацкай культуры другой паловы XVII ст., звязаныя з новымі адносінамі да мастацтва (у процілегласць сярэдневяковым поглядам), крытэрыі яго ацэнкі.

Трактат Іаанікія Коранева (“Пра спеў боскі”) як адзін з найбольш прыкметных помнікаў перадавой музычна-эстэтычнай думкі XVII ст., першая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў Расіі праца па музычнай тэорыі, у якой зроблена спроба даць абгрунтаванне прыроды музыкі як віда мастацтва.

М. Дылецкі – тэарэтык і кампазітар. “Ідэя мусікійскай граматыкі” М. Дылецкага – практычны дапаможнік па вывучэнні кампазіцыйных асноў партэснага спявання.

Асаблівасці развіцця рускай нэвукова-крытычнай думкі ў XVIII ст., шэраг змястоўных выказванняў пра ўзаемадносіны музыкі і паэзіі, пра прыроду музычных жанраў (М. Ламаносаў, А. Сумарокаў). І. Крылоў пра магчымасці стварэння рускай нацыянальнай оперы на аснове народнай песні. Рускія пісьменнікі пра народную песню.

Зараджэнне рускай гісторыяграфіі (хроніка Я. Штэліна “Весці аб музыцы ў Расіі” 1770 г.). Тэарэтыка-акустычныя аспекты вывучэння тэорыі музыкі ў навуковых распрацоўках Акадэміі навук і мастацтваў. Значэнне навуковых даследаванняў XVII–XVIII стст. для далейшых шляхоў развіцця мастацтва.

Стварэнне Адукацыйнай камісіі (1733 г.) – першага ў Еўропе міністэрства народнай асветы; яе роля ў пашырэнні ідэй асветніцтва на Беларусі. Асноўныя носьбіты асветніцкай думкі на Беларусі – С. Полацкі, К. Лышчынскі, І. Капіевіч, Г. Каніскі. Сімяон Полацкі (1629–1680 гг.) пра мастацтва, падзел ім відаў мастацтва на “механічныя” і “духоўную творчасць” (паэзія, музыка і іканапіс). Яго меркаванні пра духоўна-эстэтычныя каштоўнасці музыкі і жывапісу. Сігізмунд Лаўксмін (1569–1670 гг.) – аўтар першых айчынных падручнікаў па грэчаскай мове, музыцы і рыторыцы.

*Тэатральнае мастацтва*. Артыкулы аб тэатры Ф. Пракаповіча, М. Ламаносава, Ф. Штрубэ, В. Трэдзіякоўскага, А. Сумарокава, М. Навікова (1705–1780 гг.). Першая дакументальная праца Я. Штэліна “Кароткія звесткі пра тэатральныя прадстаўленні ў Расіі ад іх пачатку да 1768 года” (1779 г.). “Гісторыя рускага тэатра” І. Дзмітрэўскага (1792 г., рукапіс не знойдзены).

Трактат М. Сарбеўскага “Пра трагедыю і камедыю, або Сенэка і Тэрэнцый” (першая палова XVII ст.). “Збор розных твораў” (Т. 3) Я. Фалькоўскага (прыблізна 1720–1730 гг.). “Правілы паэтычнага мастацтва” Г. Каніскага (1746 г.), “Пра красамоўства паэзіі” Ф. Галянскага (1786 г.).

*Выяўленчае мастацтва*. Помнікі рускай эстэтычнай думкі XVII ст. – трактат пра мастацтва жывапісу буйнейшага тэарэтыка і жывапісца Сімона Ушакова (“Слова да прыхільніка іконнага пісання”), палемічны трактат ізуграфа Іосіфа Уладзімірава, своеасаблівая праграма, у якой знайшлі адлюстраванне прагрэсіўныя тэндэнцыі ў рускай культуры. Тэарэтычныя працы пра выяўленчае мастацтва XVIII ст. І. Ф. Урванава, П. П. Чэкалеўскага, Дз. А. Галіцына.

## Тэма 6. Прадстаўнікі рамантызму пра мастацтва

*Музычнае мастацтва.* Усталяванне рамантычнага напрамку ў літаратуры і мастацтве XIX ст. Літаратары-рамантыкі – В. Гюго, Ж. Санд, Г. Гейнэ, А. Шамісо, Я. і В. Грым, І. фон Эйхендорф, Л. Цік і іншыя – пра гісторыю мінулага і народнае мастацтва.

Увасабленне ідэй сінтэзу мастацтваў у асобе творцы-рамантыка:

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

кампазітары-публіцысты Р. Шуман, Г. Берліёз, Р. Вагнер, Ф. Ліст, пісьменнік-кампазітар Э. Т. А. Гофман, іх літаратурныя творы. Э. Т. А. Гофман, нямецкі пісьменнік-рамантык, аўтар першай рамантычнай оперы (“Ундзіна”), стваральнік музычнай крытыкі. Літаратурныя творы Э. Т. А. Гофмана як рамантычны сінтэз літаратуры і мастацтва (цыкл навэл “Серапіёнавы браты”, “Крэйслерыяна”, “Жыццёвыя погляды ката Мура” і інш.). Вялікі ўплыў Э. Т. А. Гофмана на эстэтычныя погляды Р. Шумана і Р. Вагнера.

Узаемадзеянне музыкі і літаратуры ў творчасці Р. Шумана. Заснаванне Р. Шуманам “Новага музычнага часопіса” (1834 г.), адлюстраванне на старонках гэтага прагрэсіўнага выдання тэндэнцый сучаснага музычнага жыцця і мастацтва, размова аб новых талентах (Ф. Шапэне, Г. Берліёзе, Ё. Брамсе).

Літаратурна-крытычыя працы Г. Берліёза, французскага кампазітара-рамантыка (“Трактат пра інструментоўку”, 1844 г.; “Музычнае падарожжа ў Германію і Італію”, 1844 г.; “Мемуары”, 1865 і інш.).

Р. Вагнер – геніяльны нямецкі кампазітар, дырыжор, таленавіты паэт-драматург, публіцыст, тэарэтык музычнага тэатра. Літаратурныя працы Р. Вагнера (“Мастацва і рэвалюцыя”, “Мастацкі твор будачага”, “Опера і драма” (усе – 1849–1851 гг.) і інш. Сур’ёзнасць ідэйна-мастацкіх патрабаванняў да музыкі. Распрацоўка тэорыі “музычнай драмы”. Р. Вагнер як філосаф і тэарэтык мастацтва.

Развіццё музычнай крытыкі ў Беларусі XIX ст. Інфармацыйны характар артыкулаў і нататкаў пра музычнае жыццё ў газетах “Мінскія губернскія ведамасці”, “Мінскі лісток”. Развіццё музычнай фалькларыстыкі (П. Шэйн, Р. Ігнацьеў, Л. Куба, Е. Раманаў, М. Янчук, З. Радчанка).

*Тэатральнае мастацтва*. “Тэатральная газета Ковент–Гардэна” (1816–1818 гг.) і яе артыкулы аб тэатральным мастацтве Англіі. Думкі аб тэорыі тэатра і драмы Э. Т. А. Гофмана (“Незвычайныя пакуты дырэктара тэатра”, “Кавалер Глюк”, “Крэйслерыяна”). Дэмакратычны рамантызм В. Гюго (уступны артыкул да яго драмы “Кромвель”, 1820–1830 гг.). Зборнікі артыкулаў Э. Заля “Эксперыментальны раман” (1880 г.), “Нашы драматургі” (1881 г.), “Натуралізм у тэатры” (1881 г.).

Інфармацыйна-гістарычныя звесткі пра тэатральнае жыццё гарадоў Беларусі ў канцы XIX ст. у асобных выданнях і публіцыстычных крыніцах.

*Выяўленчае мастацтва*. Завяршэнне складвання ў XIX ст. мастацтвазнаўства як навукі, сістэматычнае вывучэнне шырокага кола праблем мастацтва ўсіх эпох і краін. Выпрацоўка метадалогіі, якая абапіраецца на філасофска-эстэтычную думку грамадскія і дакладныя навукі, сацыяльны рух. Т. Жэрыко – трактат “Аб стане мастацтва ў Францыі, аб школах жывапісу і культуры і аб конкурсах на Рымскую прэмію”. Ж. Міле – “Нататкі пра мастацтва”.

Дыскусія аб рэалізме, “Маніфест рэалізму” Г. Курбэ (1885 г.), часопіс “Рэалізм” (1856–1857 гг.). Акадэмічнае мастацтва і роля крытыкі. Часопісы “Глоб” (1824 г.), “Журналь де дёба” (1824 г.).

Вывучэнне беларускага мастацтва XIX ст. у Беларусі. К. Ельскі – трактат “Аб сувязі архітэктуры, скульптуры і жывапісу”, 1822 г.; А. Шэмеш –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Успаміны пра Віленскую мастацкую школу", 1844 г., "Успаміны пра Дамеля", 1845 г.; В. Смакоўскі – "Валента Ваньковіч", 1845 г.

**Тэма 7. Мастацкая крытыка і навука ў Расіі другой паловы XIX ст.**

*Музычнае мастацтва*. Уздым грамадскай актыўнасці ў парэформенны перыяд, агульны ўздым музычнай культуры і адлюстраванне гэтага працэсу ў музычнай навуцы і крытыцы. З'яўленне вялікай колькасці разнастайных матэрыялаў аб музыцы на старонках перыядычных выданняў (газет і часопісаў). Вылучэнне выдатных крытыкаў з асабістай эстэтычнай платформай – А. Сярова, У. Стасава, Ц. Кюі, Г. Лароша.

Буйнейшая фігура рускай музычнай крытыкі 1850–1860-х гг. – А. Сяроў, яго дасягненні ў галіне выпрацоўкі навуковых асноў музычнай крытыкі, метадаў мастацкага аналізу і ацэнкі музычных твораў. Артыкулы А. Сярова, прысвечаныя творчасці М. Глінкі і яго операм.

Першыя друкаваныя выступленні У. Стасава (пачатак 1850-х гг.), звязаныя з барацьбой крытыка за творчую спадчыну М. Глінкі і прапагандай дзейнасці кампазітараў балакіраўскага гуртка. Музычныя погляды У. Стасава (цыкле артыкулаў "Дваццаць пяць гадоў рускага мастацтва", прысвечаных дэкларацыі новых мастацкіх напрамкаў у рускай культуры другой паловы 1850 – пачатку 1880-х гг.).

Рэцэнзенская дзейнасць Ц. А. Кюі, яго выступленні з крытыкай шэрагу твораў кампазітараў-кучкістаў (артыкул пра оперу "Барыс Гадуноў" М. Мусаргскага), выказванні аб рускай і замежнай музыцы.

Ідэйна-эстэтычныя пазіцыі крытычнай дзейнасці Г. Лароша, яго даследаванні, прысвечаныя творчасці М. Глінкі ("М. Глінка і яго значэнне ў гісторыі рускай музыкі) і П. Чайкоўскага.

Публіцыстыка кампазітараў-кучкістаў (А. Барадзіна, М. Рымскага-Корсакава) і П. Чайкоўскага. З'яўленне ў 1880-я гг. імёнаў новых музычных крытыкаў – М. Кашкіна і С. Круглікава, прыхільнікаў ідэй і творчасці кампазітараў бяляеўскага гуртка.

Дзейнасць групы крытыкаў кансерватыўнага лагера А. Фамінцына, Расціслава (Ф. Талстога) і інш. Палемічныя спрэчкі перадавых крытыкаў на старонках газет і часопісаў па праблемах нацыянальнага мастацтва.

Поспехі ў галіне музычнай навукі (працы А. Фамінцына – "Скамарохі на Русі", 1889; "Гуслі. Рускі народны інструмент", 1890 г.; "Нарыс гісторыі музыкі ў Расіі", 1884 г.; П. Перапяліцына; работы С. Смаленскага ў галіне рускай медыявістыкі; працы па фальклярыстыцы П. Сакальскага і інш.).

Падручнікі па гармоніі П. Чайкоўскага і М. Рымскага-Корсакава як першыя вопыты стварэння вучэбна-метадычнай літаратуры для студэнтаў.

*Тэатральнае мастацтва*. Артыкулы А. Сумарокава (1806), А. Улыбышава (1819 г.), П. Вяземскага (1816 г.), М. Гнедзіча (1819 г.) пра эстэтыку класіцызму ў тэатры. А. Пушкін, М. Гогаль, А. Астроўскі і іх роля ў развіцці тэатразнаўства і тэатральнай крытыкі. В. Бялінскі ("Літаратурныя мары", 1834 г.), М. Чарнышэўскі ("Эстэтычныя адносіны мастацтва да рэчаіснасці", 1855 г.), М. Дабралюбаў (артыкул "Цёмнае царства"). "Летапіс

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рускага тэатра” П. Адамава (1861 г.), “Рускі тэатр, яго лёсы і яго гісторыі” Ф. Коні (1864 г.). Новуковая значнаць даследаванняў М. Ціхандавава, П. Куліша аб творчасці М. Гогаля (1890 г.), А. Ярцава аб акцёры П. Мачалаве (1898 г.), А. Швырова “Знакамітыя актрысы” (1902 г.). Даследаванні У. Усеваладскага-Гернгроса (“Тэатр у Расіі ў эпоху Айчыннай вайны” і “Гісторыі тэатральнай адукацыі”, 1913 г.). “Гісторыя Рускага тэатра” ў 2-х ч. Б. Батнаке (1908 – 1910 гг.)

Першыя тэарэтычныя працы рэжысераў: У. Неміровіча-Данчанкі, У. Меерхольда, Ф. Камісаржэўскага, М. Еўрэінава, У. Сахноўскага і інш.

*Выяўленчае мастацтва*. Стварэнне праграмы рускага мастацтва і дзейнасць В. Бялінскага, А. Герцэна, М. Агарова. Рэвалюцыйна-дэмакратычная эстэтыка М. Чарнышэўскга, М. Дабралюбава, як база для крытычных выступленняў У. Стасава, востапраблемных артыкулаў І. Крамскога. Ідэя фарміравання нацыянальнай школы. П. Чысцякоў і яго сістэма мастацкай адукацыі. Румянцаўскі музей і яго значэнне для развіцця навуковай думкі ў галіне выяўленчага мастацтва.

### Тэма 8. Музычная крытыка і навука ХХ ст.

Праблемы музычнай крытыкі Заходняй Еўропы ў ХХ ст., звязаныя з асэнсаваннем новых творчых плыняў у мастацтве. Паленіка вакол творчасці К. Дэбюсі. Р. Ралан і яго музычна-крытычная спадчына. Заходнееўрапейскія музычныя крытыкі аб творчасці рускіх кампазітараў. Навуковыя даследаванні ў галіне музычнага мастацтва (Х. Рыман, Э. Курт і іх распрацоўкі ў межах тэорыі музыкі; музычна-гістарычныя працы Г. Аберта, Х. Мерсмана, Х. Штукеншмідта і інш.). Уздзеянне на працы замежных даследчыкаў філасофскіх поглядаў Т. Адорна. Музычна-тэарэтычная дзейнасць вядомых замежных кампазітараў (П. Хіндэміта, А. Шонберга, А. Вэберна і інш).

Шляхі развіцця навукова-крытычнай музычнай думкі ў Расіі ХХ ст. Барацьба разнастайных ідэйна-эстэтычных напрамкаў (паленіка вакол позніх твораў А. Скрабіна, першых твораў І. Стравінскага і С. Пракоф’ева). Вядомыя музыказнаўцы пачатку ХХ ст.: В. Каратыгін, А. Асоўскі, кампазітар М. Мяскоўскі і інш. Першыя выступленні (з 1914 г.) у перыядычным друку Б. Асафьева (Ігара Глебава), яго музычна-крытычная і навуковая дзейнасць. Выдатныя прадстаўнікі савецкага музыказнаўства – І. Салерцінскі, С. Скрабкоў, Л. Мазель, Г. Хубаў, А. Альшванг, Ю. Келдыш, Т. Ліванава, А. Сохар і інш. Іх навуковыя працы і крытычныя выступленні па праблемах музычнага мастацтва.

Асветніцкія тэндэнцыі навукова-крытычнай думкі ў Беларусі 1920–1930-х гг. Прафесійна-прапагандысцкая дзейнасць музыказнаўцаў Ю. Дрэйзіна, Б. Смольскага, а таксама кампазітараў М. Аладава, М. Крошнера, Я. Цікоцкага і інш. Пашырэнне жанравага і тэматычнага дыяпазону беларускай музычнай крытыкі і навукі ў пасляваенны час. У галіне фалькларыстыкі – Р. Шырма Т. Цітовіч, Л. Мухарынская, З. Мажэйка, Г. Назіна; у галіне тэарэтычных даследаванняў – М. Юдзеніч, В. Ялатаў, Л. Друкт, Р. Аладава, у галіне гістарычнага музыказнаўства – І. і С. Нісневічы, Т. Дубкова, Г. Куляшова, Т. Шчарбакова, В. Пракапцова, Л. Голікава, В. Дадзіёмава; у галіне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйна-прапагандысцкай дзейнасці – В. Сізко, Л. Ракава, І. Зубрыч; у галіне радыё і тэлеінфармацыі – Э. Язерская, Д. Яканюк, І. Мільто; у галіне музычнай журналістыкі – Дз. Падбярэзскі, С. Берасцень.

## Тэма 9. Навукова-крытычная думка XX ст. у галіне выяўленчага мастацтва

Тэарэтычныя канцэпцыі развіцця заходнееўрапейскага і рускага мастацтва ў пачатку XX ст. Галоўныя тэндэнцыі і прызнакі, якія фарміравалі мастацтва XX ст.: сацыяльна-гістарычныя ідэі, нацыянальныя асаблівасці, ідэйна-мастацкая праблематыка. Іх асэнсаванне крытыкай як асновы пераломных працэсаў у мастацтве краін Заходняй Еўропы. Ацэнка гісторыка-мастацкага развіцця рэалізму ў Германіі (А. Менцэль), Бельгіі (Л. Фрэдэрык), Польшчы (Ю. Хельмоньскі і Я. Вычульскі), Чэхіі (М. Мысльбэк), Балгарыі (Я. Вешын і І. Мырквічка). Крытыка мадэрнізмзу. Абгрунтаванне ідэі і практыка кубізму ў працах Дж. Гольдзінга, М. Серыалаза, А. Гелена, Ж. Мартэна. Эвалюцыя тэарэтычных поглядаў на “новае” мастацтва і ўплыў на яго развіццё прапагандысцкай дзейнасці Ф. Марынэцці, П. Пікаса, Г. Мюнха, С. Далі, К. Кандзінскага, К. Малевіча.

Эвалюцыя тэарэтычных канцэпцый развіцця мастацтва ў Расіі пачатку XX ст. Ідэі народнасці ў працах У. Стасава і Г. Плеханава. Ідэя нацыянальнай гісторыі ў творчай і тэарэтычнай дзейнасці вядомых мастакоў трупы. “Свет мастацтваў” А. Бенуа, М. Дабужынскага, К. Сомава. Фарміраванне дэмакратычнага напрамку ў тэарэтычна-творчай практыцы “Саюза рускіх мастакоў” (А. Архіпаў, В. Васняцоў і інш.).

Роля выдавецкай і выставачнай дзейнасці ў станаўленні і папулярызацыі тэарэтычных поглядаў на шляхі развіцця мастацтва (часопіс “Свет мастацтва” 1896–1904 гг., сусветныя выстаўкі 1898, 1899 гг. у Маскве, 1905 г. – у Пецярбурзе, 1906 г. – “Восеньскія сезоны” у Парыжы). С. Дзягілеў – праваднік ідэі народнасці ў жыццё.

Фарміраванне навукова-крытычнай думкі ў савецкі перыяд (1920 – 1930-я гг.). Адмова ад нацыянальнай спадчыны ў канцэпцыі Пралеткульта. Праграма развіцця мастацтва ў першых дэкрэтах і пастановах савецкай улады: ад 5 снежня 1918 г. “Дыкрэт пра рэгістрацыю, прыём на ўлік і захаванне помнікаў мастацтва і даўніны”, ад 16 лістапада, 1918 г. “Пра прызнанне навуковых, літаратурных, музычных і мастацкіх твораў дзяржаўнай уласнасцю”. Значэнне нацыяналізацыі музеяў, прыватных калекцый для развіцця мастацтвазнаўчай навукі. “План манументальнай прапаганды” (Дэкрэт “Пра помнікі рэспублікі”, 1918 г.) – вызначальная праграма перспектывы тэорыі мастацтвазнаўчай навукі.

Увасабленне тэарэтычных канцэпцый новага мастацтва ў праграмах падрыхтоўкі мастакоў у вядомых навучальных установах Масквы (Вышэйшыя мастацка-тэхнічныя майстэрні), Петраграда (Вышэйшы мастацка-тэхнічны інстытут, Акадэміі мастацтваў), Віцебска (Віцебскі мастацкі тэхнікум), Мінска (Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, Мінскі мастацкі тэхнікум).

Крытыка ідэйна-стылістычных канцэпцый развіцця мастацтва ў працах

беларускіх тэарэтыкаў мастацтва М. Шчакаціхіна, М. Кацара, П. Масленікава, Л. Дробава, П. Карнача, В. Шматава, Л. Сахуты, Л. Налівайкі.

### Тэма 10. Навукова-крытычная думка XX ст. у галіне тэатральнага мастацтва

Навукова-тэатразнаўчыя даследаванні А. Брэтона (1905 г.) і Б.Стокера (1906 г.) пра акцёраў Ч. Ірвінге, Ф. Хэджака пра акцёра Чарыке (1912 г.). Навуковы агляд "Брытанская драма" А. Нікола (1925 г.), "Сучасная англійская драма" (1-я палова XX ст.) Э. Рэйналдса (1949 г.), "Развіццё тэатра" А. Нікалу (1966 г.).

Берлінскае аб'яднанне па вывучэнню гісторыі тэатра (1902–1920 гг.). Працы Макса Германа (пачынальніка германскага тэатразнаўства) – "Даследаванні па гісторыі нямецкага тэатра сярэдніх вякоў і Адраджэння" (1914 г.). "Гісторыя тэатра" ў 7 т. Г. Кіндэрмона (1957–1966 гг.). Навуковыя працы Э. Піскатора і Б. Брэхта.

Тэарэтычныя працы пра тэатр Р. Ралана ("Народны тэатр", 1903 г.). "Тэатразнаўчы фонд Францыі" А. Радэле (1933 г.). Ж. Вілар і яго кніга "Пра тэатральную традыцыю" (1955 г.). Сучасныя французскія тэатразнаўцы (Г. Бацю, Л. Мусінак, Ж. Жынесці, Р. Ланс, А. Боль, П. Сюрэ і інш.).

Першыя тэатразнаўцы Расіі пачатку XX ст. (А. Бялецкі, П. Маркаў, Б. Алпф, С. Ігнатаў, Я. Кузняцоў, П. Навіцкі і інш.). К. С. Станіслаўскі і значэнне яго працы "Работа акцёра над сабой" (1938 г.) для развіцця сусветнага тэатра.

Навукова-даследчыя манаграфіі А. Анастас'ева, Б. Рудніцкага, Г. Баяджыева, Б. Растоцкага, А. Анікста, Ю. Дзмітрыева, С. Макульскага, М. Кнэбель, Б. Захавы, У. Волькенштэйна, А. Папамышава, У. Сахноўскага-Панкеева, Г. Таўстаногава, А. Эфраса і інш., іх роля ў развіцці сучаснай навукі пра тэатр.

Першы на Беларусі падручнік для аматарскіх драматычных гурткоў А. Ляжневіча "Сялянскі тэатр" (1928 г.). Кніга А. Некрашэвіча "БДТ-1" (1930 г.). Крытычныя выступленні пісьменнікаў У. Галубка, Б. Вольскага, М. Клімовіча, Я. Коласа, Б. Мікуліча, Я. Рамановіча, К. Чорнага, І. Чурскага ў зборніку "Драматургія" (1934 г.). Тэатразнаўства У. Няфёд і яго працы: "Беларускі тэатр: Нарыс гісторыі" (1959 г.), "Тэатр у ваенныя гады" (1959 г.), "Сучасны беларускі тэатр" (1961 г.), "Станаўленне драматычнага тэатра" (1966–1971 гг.), "Роздум пра драматычны канфлікт" (1970 г.) і інш. Акадэмічнае калектыўнае даследаванне ў 3-х т. "Гісторыя беларускага тэатра" (1983–1987 гг.). Навуковыя працы сучасных тэатразнаўцаў: Т. Барысавай "Шэкспір на беларускай сцэне" (1964 г.) і "Мальер на беларускай сцэне" (1972 г.); А. Лабовіча "П'есы Д. М. Астроўскага на беларускай сцэне" (1971 г.); Т. Гаробчанкі "Купалаўскія вобразы на беларускай сцэне" (1976 г.); С. Пятровіча "Якуб Колас і беларускі тэатр" (1975 г.); Ю. Сохара "На пульсе жыцця: Андрэй Макаёнак і беларускі тэатр" (1979 г.); М. Каладзінскага "Тэатр лялек Савецкай Беларусі" (1976 г.); Ю. Пашкіна "Рускі драматычны тэатр у Беларусі XIX ст." (1980 г.); А. Сабалеўскага "Беларуская савецкая драма" (кн. 1–2, 1969–1972 гг.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Р. Смольскага "На сцэне – бессмяротнасць подзвігу" (1982 г.) і "Нашчадкам у спадчыну: Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў беларускім тэатры 80-х гг." (1986 г.); Г. Барышава "Тэатральная культура Беларусі XVIII ст." (1992). Навукова-крытычная думка ў галіне тэатральнага мастацтва канца XX ст.

**Тэма 11. Навукова-гістарычная думка XX ст. у галіне кінамастацтва**

"Маніфест сямі мастацтваў" Рычота Кануда (1911 г.) – першая спроба тэарэтычных абагульненняў на пачатку XX ст. Адкрыццё сінтэтычнай прыроды кіно (гармонія пластыкі і руху). Прагназіраванне мастацкіх магчымасцей экраннага відовшча. Росквіт кінатэорыі ў 1920-я гг. Бэла Балаш – даследчык выразных сродкаў кіно: набліжэнне, ракурс, мангаж ("Бачны чалавек", 1924 г.; "Дух фільма", 1930 г.). Канцэпцыя Луі Мусінака пра мантаж ("Нараджэнне кіно", 1925 г.). Рудольф Арнхейм пра ўмоўнасці экраннага адлюстравання рэчаіснасці ў мастацкай прыродзе кіно ("Кіно як мастацтва", 1932 г.).

Рэжысёрскі ўклад у распрацоўку тэорыі кінамастацтва. "Мантаж атракцыёнаў", тэорыя тыпажу, інтэлектуальнага кіно і гуказрокавага кантрапункту Сяргея Эйзенштэйна (даследаванні "Нераўнадушная прырода", "Мантаж", "Каляровае кіно" і інш.). Канцэпцыя мантажу Усевалада Пудоўкіна. Яго сістэма работ з акцёрамі. Кінематограф як рухомае малярства. Распрацоўка ідэі ў артыкулах Л. Дэлюка, Ж. Эпштэйна, Х. Рыхтэра.

Асноўныя тэарэтычныя напрацоўкі ў галіне кіназнаўства на працягу 1940–1960-х гг. Італьянскі нэарэалізм і новае мысленне: У. Барбара, Г. Арыстарка. Падзел экранных твораў на "відовішча" і "фільм" (чыстае кіно, вызваленне ад элементаў іншых мастацтваў). Анры Базэн. Канцэпцыя дакументальнага рэалізму: фільм ёсць вышэйшай формай фатаграфіі. Два метады стварэння экранных твораў: – сцэнапіс аналітычны (традыцыйны мантажны фільм): – сцэнапіс цэласны (глыбінная мізансцэна, план-эпізод, рухлівасць камеры).

Зігфрыд Кракауэр. Аналіз рэалістычнай і харматворчай тэндэнцый у кіно на ўзроўні драматургіі, адлюстравання, гуку. Тэарэтычная праца "Прырода фільма. Рэабілітацыя фізічнай рэчаіснасці" (1960 г.). Я. Добін і тэорыя метафарычнага кіно ("Паэзія ў кіно", 1961 г.).

Адкрыццё кінаінстытута ў Сарбоне. Уваходжанне кінатэорый у сістэму культуралагічных навук. З'яўленне першых даследчых калектываў. Узнікненне навуковага інтарэсу да сацыяльна-псіхалагічных аспектаў кінакамунікацыі. Канцэпцыя Э. Марэна: "праекцыя ідэнтыфікацыі", як механізм успрыняцця кінатвораў на падставе злучэння рэальнага з ірэальным у кінемагаграфічнай прыродзе ("Кіно ці ўяўны чалавек", 1956 г.).

